*А. А. Суша*

# СТАНАЎЛЕННЕ БІБЛІЯТЭК НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ПОЛАЦКА ў XVI–XIX стст.

*Артыкул прысвечаны ўзнікненню і развіццю бібліятэк адукацыйных установаў у найстаражытнейшым беларускім горадзе Полацку. Гэтыя бібліятэкі існавалі на падставе розных царкоўных (каталіцкіх, уніяцкіх, праваслаўных, іудзейскіх) і свецкіх (дзяржаўных і грамадскіх) школ рознага ўзроўню (ад пачатковых да вышэйшых). Некаторыя з іх захоўвалі вялікія (больш за 50 000) кніжныя зборы і зрабіліся інфармацыйнымі і культурнымі цэнтрамі рэгіёна.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Полацк – самы старажытны горад Беларусі. Ён упершыню згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 г. У X–XII стст. горад стаяў на гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» і быў сталіцай Полацкага княства. Скандынаўскія сагі апавядаюць пра полацкія дружыны, якія хадзілі пад сцены Царграда. «Слова аб паходзе Ігаравым» славіць мужнасць палачан і мудрасць князя Усяслава, празванага Чарадзеем. У сярэдзіне XI ст. у Полацку (таксама як у Кіеве і Ноўгарадзе) быў збудаваны сабор Св. Сафіі, што сведчыла аб высокім становішчы горада, яго імкненні быць адным з цэнтраў палітычнага і культурнага жыцця рэгіёна. З Полацкам звязаны імёны такіх вядомых культурных дзеячаў, як Еўфрасіння Полацкая (першая ўсходнеславянская святая, князёўна, заснавальніца некалькіх полацкіх манастыроў, ігуменне, нябесная апякунка Беларусі), Францыск Скарына (першы ўсходнеславянскі кнігадрукар, навуковец, мысліцель, пісьменнік, перакладчык Святога Пісання), Сімяон Полацкі (вядомы асветнік, пісьменнік, перакладчык, педагог, царкоўны дзеяч).

Безумоўна, з’яўленне такіх яркіх асоб магло быць магчымым толькі ў буйным культурным цэнтры, які мае развітую сістэму ўстаноў адукацыі і культуры. Менавіта такім культурным цэнтрам быў Полацк. Ён вядомы сваімі кніжнымі традыцыямі яшчэ з XI ст., калі пры полацкім Сафійскім саборы пачала фарміравацца буйная бібліятэка. У XII ст. Еўфрасіння Полацкая, пасяліўшыся ў келлі пры Сафійскім саборы, шмат чытала і займалася перапісваннем кніг. Існавалі ў горадзе і іншыя бібліятэкі.

Адной з найбольш цікавых, аднак мала вывучаных, старонак у гісторыі кніжнай культуры гэтага старажытнага беларускага горада

з'яўляецца функцыянаванне бібліятэк пры рознага роду навучальных установах. Першыя адукацыйныя структуры з'явіліся ў Полацку яшчэ ў старажытнасці – пры найбуйнейшых манастырах. Вядома, што ў XI–XVI стст. існавалі наступныя полацкія манастыры: Сафійскі, Спаса-Еўфрасіннеўскі, Бельчыцкі Барысаглебскі, Багародзіцкі, Богаяўленскі, Казьмадзям'янаўскі, Пятроўскі, Юр'еўскі, Машонацкі Уваскрасенскі, Экіманскі Іаана-Прадцечанскі, Траецкі Запалоцкі, Праабражэнскі Запалоцкі, Гарадзецкі Міхайлаўскі, Лучанскі Мікалаеўскі праваслаўныя манастыры [13]. Пры шматлікіх з іх дзейнічалі школы і вучэльні.

Як вядома, Беларусь здаўна славілася верацярпімасцю і мела поліканфесіянальны характар. Таму і ў Полацку з даўніх часоў побач з праваслаўнымі храмамі і манастырамі існавалі рэлігійныя структуры іншых канфесій, прычым не толькі хрысціянскіх. Найбольш прадстаўнічай з іх, безумоўна, была каталіцкая царква. Яна таксама была прадстаўлена ў Полацку шэрагам храмаў і манастыроў, пры шматлікіх з якіх дзейнічалі навучальныя ўстановы рознага ўзроўню. Так, напрыклад, лічыцца, што першадрукар Ф. Скарына атрымаў першапачатковую адукацыю ў Полацкім бернардынскім манастыры [12]. Шэраг навучальных устаноў існаваў у XVII–XIX стст. пры розных структурах уніяцкай царквы (у Полацку знаходзіўся цэнтр адной з самых важных уніяцкіх архіепархій) [9].

Аднак невялікія школы пры храмах і манастырах не мелі самастойнага характару, тым больш самастойных бібліятэк і карысталіся кніжнымі зборамі тых жа храмаў і манастыроў. Па гэтай прычыне ў дадзеным матэрыяле гутарка пра іх існаванні не будзе. Мы звернем увагу на адукацыйныя ўстановы Полацка, якія мелі самастойны характар – калегіумы, семінарыі, акадэміі, гімназіі і інш.

Лёс бібліятэк асобных з гэтых навучальных устаноў даволі добра (хаця яшчэ недастаткова) даследаваны. Як прыклад, можна назваць бібліятэку Полацкага езуіцкага калегіума (акадэміі). Яе гісторыя даволі добра даследавана беларускімі і замежнымі аўтарамі, што, аднак, не стала прычынай з'яўлення самастойнага грунтоўнага манаграфічнага даследавання. У той жа час гісторыя бібліятэк іншых навучальных устаноў Полацка дасюль яшчэ амаль не вывучана. У гэтым матэрыяле аўтар ставіць задачу не паглыбіць аналіз вядомага акадэмічнага кнігазбору ў Полацку, а ўпісаць яго лёс у кантэкст станаўлення і развіцця бібліятэк адукацыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

установ Полацка ў цэлым. Гэта дазволіць зрабіць пэўныя высновы пра агульныя тэндэнцыі развіцця адпаведных бібліятэк у кантэксце вядомых працэсаў XIX ст.: русіфікацыя, аправаслаўленне, ліквідацыя уніі, непаслядоўнасць царскай улады ў дачыненні да ордэна езуітаў, ліквідацыя адметнасцей беларускага праваслаўя, секулярызацыя культуры, вываз культурных каштоўнасцей з беларускіх зямель і інш.

Першай буйной навучальнай установай Полацка лічыцца Полацкі езуіцкі калегіум, які быў заснаваны ў 1580 г. У 1812 г. калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію з правамі ўніверсітэта. Пры ім стварауся і найбуйнейшы кнігазбор горада. Бібліятэка Полацкага езуіцкага калегіума стала адным з цэнтраў інтэлектуальнага жыцця Беларусі, была прадметам пастаяннага клопату полацкіх езуітаў, іх галоўным упрыгажэннем і багаццем [2, с. 242]. Трэба сказаць, што бібліятэка (і як збор кніг, і як памяшканне для іх захоўвання) з'яўлялася абавязковым элементам кожнага калегіума ці рэзідэнцыі ордэна езуітаў [14, с. 225].

Полацкая езуіцкая бібліятэка хутка папаўнялася з пачатку XVII ст. за кошт набыцця новых кніг і атрымання выданняў у дар ад відных дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў свайго часу. Неаднаразова бібліятэка Полацкага езуіцкага калегіума нішчылася падчас ваенных дзеянняў і стыхійных бедстваў. Напрыклад, яна значна пацярпела падчас вайны 1654–1667 гг., пасля якой увесь калегіум прыйшлося аднаўляць наноў. Падчас вялікага пажару 1682 г. частка бібліятэкі згарэла [1, с. 77; 15, с. 43]. Каб забяспечыць яе лепшую захаванасць, езуіты пасля пажару перанеслі бібліятэку ў новы каменны будынак. У 1705 г., асцерагаючыся шведскага нападу, езуіты вывезлі бібліятэку калегіума ў будынкі былога Спаскага манастыра, якім яны валодалі з XVI ст. Аднак у апошні дзень пераезду амаль уся бібліятэка згарэла [1, с. 77]. У чарговы раз адноўленыя зборы полацкіх езуітаў былі знішчаны пажарам 1750 г. [1, с. 78; 15, с. 43]. І зноў жа пры калегіуме пачалося аднаўленне бібліятэкі, на гэты раз – у мураваным будынку калегіума.

Кардынальна новымі былі ўмовы фарміравання бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума пасля 1772 г., калі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай усходняя частка Беларусі была далучана да Расійскай імперыі. У ліку далучаных да Расіі гарадоў быў і Полацк. Праз год пасля гэтай падзеі, гэта значыць у 1773 г., дзейнасць ордэна езуітаў была забаронена рашэннем папы рымскага. Аднак Кацярына II дадзенае рашэнне не падтрымала, і на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыторыі імперыі езуіты працягнулі сваю дзейнасць. Полацк фактычна стаў іх сталіцай. Больш таго, з 1777 г. пры Полацкім калегіуме быў адкрыты адзіны ў тагачаснай Еўропе езуіцкі навіцыят (установа для падрыхтоўкі манахаў) [15, с. 43].

Пераезд у Полацк вялікай колькасці высокаадукаваных прадстаўнікоў ордэна з Францыі, Італіі, Галандыі і іншых краін суправаджаўся перамяшчэннем сюды іх кніжных збораў. У гэты час у фондах бібліятэкі адбылося істотнае парушэнне прапорцыі паміж кнігамі з друкарань Рэчы Паспалітай і еўрапейскімі выданнямі. У 1787 г. у інвентары кніг бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума былі пазначаны кнігі 5576 аўтараў, пад імѐнамі асобных з іх значылася да 50 выданняў [1, с. 78; 15, с. 44]. У 1806 г. колькасць кніг у бібліятэцы ўзрасла да 20 тысяч, у 1815 г. – да 35 тысяч. Ёсць звесткі, што напярэдадні закрыцця акадэміі яе бібліятэка налічвала да 60 тысяч тамоў [15, с. 50]. Багаццем і разнастайнасцю бібліятэкі былі ўзрушаны многія яе наведвальнікі, сярод якіх быў і імператар Аляксандр I.

На завяршальным этапе існавання (напярэдадні выгнання езуітаў з Полацка ў 1820 г.) бібліятэка Полацкага езуіцкага калегіума складалася з Галоўнай бібліятэкі (кнігі на еўрапейскіх і ўсходніх мовах – каля 30 тыс. тамоў), Польскай бібліятэкі (выдзелена з Галоўнай у 1817 г., налічвала больш за 10 тыс. тамоў), Студэнцкай бібліятэкі, бібліятэкі клерыкаў, бібліятэкі акадэмічнай канцылярыі, бібліятэкі крамы, бібліятэкі друкарні, бібліятэкі музычнай бурсы (548 нот розных твораў) і бібліятэкі касцѐла, меўся таксама шэраг падручных бібліятэк у вучэбных памяшканнях і на руках у выкладчыкаў [2, с. 223; 15, с. 46]. Паводле правіл забаранялася блытаць кнігі паміж гэтымі бібліятэкамі [14, с. 249].

Галоўная і Польская бібліятэкі былі прызначаны толькі для прафесараў акадэміі [2, с. 223]. Яны знаходзіліся ў вялікай светлай зале (пазней Польская бібліятэка заняла асобную залу) на 2-м паверсе (над трапезнай) цэнтральнага 3-павярховага будынка калегіума, куды вяла драўляная лесвіца з прыгожымі разнымі парэнчамі. Цішыню ў зале захоўвалі падвойныя дзверы. Святло ў памяшканне трапляла праз 6 вокнаў, якія пры яркім сонцы завешваліся белым палатном. На сценах віселі 10 партрэтаў (у тым ліку Кацярыны II і Аляксандра I), на шафах стаялі 2 пазалочаныя бюсты, 4 вялікія і 16 малых драўляных вазонаў, размаляваных пад мармур. У памяшканнях была цудоўна спланавана сістэма ацяплення (у падлозе) і вентыляцыі. Пасярэдзіне залы для чытачоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаялі дзевяць сталоў з зэдлікамі, абцягнутымі скурай. Кнігі Галоўнай бібліятэкі былі расстаўлены ў 21 вялікай пакрытай лакам шафе, 9 меншых па памерах і 6 маленькіх кніжных шафах пад кожным акном. Кнігі Польскай бібліятэкі былі расстаўлены ў 8 шафах і знаходзіліся ў асобным памяшканні. Перад ім стаяла 17 агульнадаступных адкрытых шафаў Студэнцкай бібліятэкі [15, с. 47–48].

Камплектаванне бібліятэкі залежала ад утрымання адукацыйнага працэсу ў калегіуме (акадэміі). Для забеспячэння адукацыйнага працэсу на набыццѐ літаратуры ў калегіуме выдзяляліся значныя фінансавыя сродкі. Вялікія закупкі кніг адбыліся ў 1636 г. (на 300 злотых), 1643 г., 1646 г., 1647 г. (на суму больш 1000 злотых) [1, с. 77]. Напрыканцы існавання бібліятэкі на папаўненне яе збораў і набыццѐ навучальных дапаможнікаў таксама выдзяляліся немалыя сумы: да тысячы расійскіх рублѐў (у 1819 г.) [15, с. 45]. Аб'ѐм фінансавых сродкаў, адведзеных на закупку літаратуры, вызначала кіраўніцтва ордэна.

У той жа час важнай крыніцай папаўнення бібліятэкі з'яўляліся добраахвотныя ахвяраванні членаў ордэна. Так, значныя зборы ў бібліятэку яшчэ напачатку яе існавання ахвяравалі езуіты Ян Рывоцкі (1632 г.), Ян Садкоўскі (1683 г.) [1, с. 77]. Шмат еўрапейскіх выданняў прывезлі з сабою езуіты ў 1770–1790-я гг., пераязджаючы ў Полацк. Многа выданняў трапіла ў Полацк ад членаў ордэна езуітаў і каталіцкіх архірэяў у пачатку XIX ст. [15, с. 44–45].

Вялікую частку збору складалі заходнееўрапейскія выданні па філасофіі, тэалогіі, кананічным і грамадзянскім праве, царкоўнай і свецкай гісторыі, мовазнаўстве, мастацтвазнаўству, ваенных, медыцынскіх, матэматычных, тэхнічных, натуральных і іншых дысцыплінах, энцыклапедычныя, даведачныя, літаратурныя (асабліва працы класікаў) і мастацкія выданні, багатая перыѐдыка [2, с. 227]. Для патрэб школьнага тэатра пры калегіуме збіраліся выданні твораў еўрапейскіх драматургаў. Асноўным спосабам папаўнення фондаў бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума з'яўлялася набыццѐ новай літаратуры, атрыманне абавязковага асобніка з езуіцкіх друкарань Беларусі, перадача выданняў у дар (як свецкімі асобамі, так і прадстаўнікамі ордэна). Полацкая езуіцкая друкарня, што дзейнічала ў 1787–1820 гг., выпускала шмат навучальных і навуковых выданняў, якія ў абавязковым парадку паступалі ў фонды бібліятэкі калегіума. У бібліятэцы полацкіх езуітаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваліся таксама выданні каталіцкіх, пратэстанцкіх, праваслаўных і ўніяцкіх друкарань Беларусі. Па сцвярджэнні гісторыка М. Марошкіна, «бібліятэкі езуіцкіх калегій, а асабліва Полацкай, поўныя былі рускімі і славянскімі кнігамі» [2, с. 227]. Трэба сказаць, што ў 1820 г. у зборах бібліятэкі Полацкай акадэміі налічвалася 89 антыезуіцкіх кніг-пасквіляў [15, с. 54]. Да таго ж у бібліятэцы захоўвалася вялікая колькасць рукапісных кніг.

Кіраванне бібліятэкай даручалася прэфекту калегіума, чые абавязкі былі рэгламентаваны статутам ордэна і ў якасці каго звычайна абіраўся выкладчык рыторыкі і паэтыкі. Прэфект адказваў за камплектаванне фонду; сачыў за выхадам новай літаратуры; закупляў яе і прапагандаваў сярод выкладчыкаў калегіума (акадэміі); трымаў пры сабе ключы ад кнігасховішча; дапускаў да збораў толькі тых карыстальнікаў, якім гэта было дазволена; сачыў, каб забароненыя кнігі не патрапілі да непадрыхтаванага чытача; кантраляваў вяртанне выдадзенай літаратуры (вёў сшытак кнігавыдачы); расстаўляў кнігі ў прадметным парадку; складаў каталогі бібліятэкі і прад'яўляў іх правінцыялу ордэна падчас праверкі; сачыў за чысцінёй і вільготнасцю ў памяшканнях [2, с. 223; 14, с. 243–244]. Дапамогу прэфекту аказвалі малодшыя магістры і клерыкі. У выніку дзейнасці прэфектаў і іх памочнікаў на большасці захаваных выданняў з бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума маецца або рукапісная адзнака аб прыналежнасці да бібліятэкі, або адпаведны штамп ці экслібрыс.

Пасля рашэння аб прымусовым закрыцці акадэміі ў 1820 г. яе бібліятэка была часткова разрабаваная: «Наступіла сапраўднае рабаванне. На працягу некалькіх дзён бібліятэку без літасці расцягнулі. Рэдкія і дарагія кнігі прадаваліся за некалькі грошаў. Нават паліцыя дапамагала гэтаму раскраданню. Рабаванне было спынена камісіяй, прызначанай для прыняцця касцёла, бібліятэкі, рухомай і нерухомай маёмасці» [2, с. 227–228]. Праз месяц пасля выдання царскага дэкрэта аб выгнанні езуітаў зборы Галоўнай бібліятэкі скарацілася да 13 490 тамоў, Польскай – да 2434 (або 2436), Студэнцкай – да 3708, а ўсіх бібліятэк разам – да 23 563 кніг, што азначае скарачэнне больш як у два разы. Апрача таго, значылася 95 287 кніг у акадэмічнай друкарні і 4103 – у кнігарні [2, с. 228; 15, с. 54].

Рэшткі акадэмічнай бібліятэкі ў 1822 г. былі перададзены полацкім піярам, якія ў 1822–1830 гг. у будынках колішняй акадэміі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўтрымлівалі сваю вышэйшую вучэльню. Аднак у хуткім часе і гэта вучэльня была зачынена, паколькі не адпавядала духу рэформ, якія праводзіліся Мікалаем I па распаўсюджванні праваслаўя і нейтралізацыі заходняга ўплыву ў Беларусі.

Пасля закрыцця піярскай вучэльні цікавасць да ў чарговы раз пакінутай без гаспадара багатай полацкай бібліятэкі выказалі імператар Мікалай I, міністр унутраных спраў Д. М. Блудаў, міністр народнай асветы князь К. А. Лівен, дырэктар Імператарскай публічнай бібліятэкі А. М. Аленін і іншыя вядомыя дзеячы рускай культуры. Пасля вывучэння і разбору бібліятэкі адмыслова прызначанай у 1830 г. камісіяй асноўная і найбольш каштоўная частка збору полацкіх езуітаў і піяраў была размеркаваная паміж буйнейшымі публічнымі бібліятэкамі і навучальнымі ўстановамі Масквы і Пецярбурга, а невялікая частка перададзена беларускім гімназіям. Створанаму ў 1835 г. Полацкаму кадэцкаму корпусу пакінулі толькі 2080 кніг (1477 тытулаў) па ваеннай справе, матэматычных і прыродазнаўчых навуках [3, с. 43–46; 5, с. 149; 6, с. 96; 15, с. 84–85]. Сёння фрагменты бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі захоўваюцца ў зборах Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі, у тым ліку ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі – некалькі соцень выданняў. Няспешна, але планамерна ідзе вывучэнне буйнейшага полацкага кнігазбору, разглядаюцца магчымыя шляхі бібліяграфічнай і віртуальнай (паўнатэкставай) рэканструкцыі гэтай гістарычнай калекцыі.

Бібліятэка езуіцкай акадэміі была найбуйнейшым кніжным зборам пры каталіцкай навучальнай установе ў Полацку. Мала адставалі ад каталікоў і ўніяты. У Полацку яны таксама актыўна займаліся адукацыйнай дзейнасцю і мелі ў гэтым значны поспех. Найбуйнейшай уніяцкай навучальнай установай у горадзе стала Полацкая духоўная семінарыя (яна таксама называлася Беларускай духоўнай семінарыяй). Яна была заснавана мітрапалітам Іраклієм Лісоўскім у 1806 г. і праіснавала да ліквідацыі уніі ў Беларусі ў 1839 г., а пасля была пераўтворана ў праваслаўную духоўную семінарыю [4, с. 466–467; 16, с. 148–157]. У 1820-я гг. вялася падрыхтоўка да адкрыцця на базе семінарыі вышэйшай навучальнай установы – уніяцкай духоўнай акадэміі, якая здольная была б стварыць процівагу Галоўнай духоўнай семінарыі пры Віленскім універсітэце (у апошняй уніяты вучыліся сумесна з каталікамі і маглі патрапіць пад уплыў апошніх, што не надта падабалася ўладам). Аднак дадзены праект рэалізаваны не быў з-за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слушнага меркавання, што стварэнне акадэміі будзе спрыяць згуртаванню і ўзмацненню ўніяцкай царквы [7]. У 1856 г., ужо пасля ліквідацыі уніі, семінарыя зусім была пераведзена ў Віцебск, дзе праіснавала да 1917 г. [4, с. 464–465].

Як вядома, пры Полацкім Сафійскім саборы як цэнтры буйной архіепархіі існаваў манастыр базыльян, які здаўна ўтрымліваў школу, што забяспечвала даволі высокі ўзровень адукацыі. Аднак самастойная навучальная ўстанова ў выглядзе духоўнай семінарыі ўзнікла толькі ў пачатку XIX ст. Бібліятэка Полацкай духоўнай семінарыі пачала збірацца ў 1807 г. [5, с. 151]. Першапачатковую базу для яе склалі царкоўныя і манастырскія бібліятэкі Полацкай уніяцкай архіепархіі. Да таго ж многія выданні набываліся і перадаваліся ў дар з Расіі і іншых краін.

Першапачаткова бібліятэка размяшчалася ў архіепіскапскай рэзідэнцыі ў Струні пад Полацкам, а ў 1808 г. была пераведзена ў Полацк у будынкі зачыненага манастыра базыльян пры Полацкім Сафійскім саборы [16, с. 148–149]. Адпаведна зборы Полацкага манастыра базыльян і Полацкага Сафійскага сабора ўліліся ў калекцыі створанай семінарыі. У 1812 г. бібліятэка была разрабавана французамі. Не губляючы часу базыльяне разам з аднаўленнем дзейнасці семінарыі прыступілі ў 1813 г. да аднаўлення яе бібліятэкі. Прычым кнігазбор напачатку размяшчаўся як у самім Полацку, так і ў вѐсцы Судзіловічы Лепельскага павета, дзе да 1821 г. знаходзілася сярэдняя духоўная школа (ніжэйшае аддзяленне семінарыі) [16, с. 149]. Шэраг выданняў быў падораны бібліятэцы праваслаўнымі і ўніяцкімі архірэямі (напрыклад, І. Лісоўскім, І. Красоўскім, Я. Мартусевічам, В. Садкоўскім і інш.). У 1830-х гг. кнігазбор Полацкай духоўнай семінарыі папоўніўся кніжнымі бібліятэчнымі зборамі шэрагу зачыненых базыльянскіх (уніяцкіх) манастыроў і навучальных устаноў пры іх, пра што сведчаць не толькі гістарычныя крыніцы, але і адзнакі на кнігах папярэдніх уладальнікаў.

Пасля прыбыцця ў 1833 г. у Полацк епіскапаў Смарагда Крыжаноўскага і Васіля Лужынскага значна актывізавалася паступленне ў бібліятэку семінарыі кніг з Расіі [11, с. 12]. Разам з тым з ужытку выводзілі і не выдавалі навучэнцам падручнікі, катэхізісы і богаслужэбныя выданні ўніяцкіх друкарань і кнігі заходніх аўтараў. Рэформа выклікала супраціў як выкладчыкаў, якія не жадалі карыстацца расійскай літаратурай, так і семінарыстаў, якія пакінулі на кнігах мноства нататак аб няслушнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праваслаўнага багаслоўя і царкоўнай гісторыі ў трактоўцы расійскіх аўтараў (напрыклад, у Сімвале Веры дапісвалі філіоквэ і выкрэслівалі абразлівыя заўвагі пра унію) [11, с. 12–13].

Для бібліятэкі Полацкай духоўнай семінарыі былі адведзены асобныя памяшканні. За паступленнем літаратуры сачылі прэфекты (інспектары) семінарыі. Першапачаткова прыналежнасць кніг да семінарскай бібліятэкі пазначалася рукапіснай адзнакай на польскай мове «Z Biblioteki Seminar Połockiego», пазней – друкаваным штампам «БИБЛИОТЕКА ПОЛОЦК: ДУХОВ: СЕМИНАРИИ», які звычайна прастаўляўся на тытульным аркушы выдання. У 1856 г. бібліятэка разам з семінарыяй была пераведзена ў Віцебск (у 1869 г. яе фонд дасягнуў 6 тысяч тамоў) [5, с. 151].

У 1903 г. па распараджэнні Сінода найбольш рэдкія і каштоўныя кнігі з гэтай бібліятэкі былі перададзены Кіеўскай духоўнай акадэміі. Спецыялісты, якія прыехалі з Кіева, падрабязна агледзелі даўнюю частку бібліятэкі і забралі з сабою амаль усе кнігі – змест 17 з 18 шафаў [5, с. 152]. У камісію для перадачы кніг Кіеўскай акадэміі ўваходзілі этнограф і фалькларыст Мікалай Нікіфароўскі і гісторык Дзмітрый Даўгяла [10]. Малаверагодна, што гэтыя людзі падтрымлівалі вываз культурных каштоўнасцей з роднага краю. Да таго ж яны абодва ў свой час скончылі Віцебскую духоўную семінарыю, у якой якраз захоўваліся кнігі з Полацка. Безумоўна, яны карысталіся старой бібліятэкай і добра ведалі пра яе каштоўнасць. Магчыма, яны ніяк не маглі паўплываць на ўжо прынятае рашэнне аб вывазе кніг у Кіеў. З іншага боку, імаверна, што яны клапаціліся пра лепшае захаванне каштоўнага кнігазбору, якое ў Кіеве можна было б лепш забяспечыць. Тым больш, што гэты горад на той час не быў замежным.

Аднак для Беларусі чарговы айчынны кнігазбор аказаўся страчаным. З жалем можна ўспрыняць словы аднаго з сучаснікаў тых падзей: «Тое, што з вялікай працай і любоўю сабралі нашы продкі, мы саступілі амаль без шкадавання» [5, с. 152]. Апісанне вывезеных у Кіеў кніг было апублікавана ў 1906 г. А. С. Крылоўскім у «Сістэматычным каталогу кніг бібліятэкі Кіеўскай духоўнай акадэміі (былой Полацкай уніяцкай бібліятэкі)» [8]. Цяпер гэтая частка бібліятэкі Полацкай духоўнай семінарыі захоўваецца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У. Вярнадскага. Пакінутая частка бібліятэкі разам са зборамі Віцебскай духоўнай семінарыі ў 1920-я гг. паступіла ў фонды Дзяржаўнай бібліятэкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

БССР (цяпер – Нацыянальная бібліятэка Беларусі), дзе захоўваецца дагэтуль.

Значнасць бібліятэкі Полацкай духоўнай семінарыі абумоўлена яе разнастайнасцю і вялікай колькасцю ў яе складзе дакументаў беларускага паходжання. У адпаведнасці з навучальнай праграмай у бібліятэку паступалі кнігі Бібліі, богаслужэбныя выданні, праваслаўныя, каталіцкія і ўніяцкія катэхізісы, навуковыя і навучальныя выданні па багаслоўі, філасофіі, этыцы, гісторыі, юрыспрудэнцыі, мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, натуральных і матэматычных навуках, літаратурныя працы, энцыклапедыі і даведнікі, перыядычныя выданні. Асноўную частку складалі старадрукаваныя кнігі на лацінскай (большасць), польскай, нямецкай, французскай, італьянскай, рускай, старабеларускай, грэчаскай мовах, выдадзеныя ў XVI–XIX стст. Аднак меліся таксама выданні і рукапісы на дацкай, галандскай, іспанскай, шведскай, яўрэйскай, персідскай, «татарскай» і іншых мовах [8]. У сувязі з гэтым здзіўляе пазіцыя даследчыкаў савецкага часу, заснаваная больш на перакананнях аўтараў, чым на фактах: «У пераважнай большасці сваёй гэта былі, безумоўна, багаслоўскія кнігі на лацінскай мове. Рускіх кніг налічвалася вельмі мала, а грэчаскіх не было зусім» [5, с. 151–152].

Унікальным з’яўлялася папаўненне бібліятэкі семінарыі выданнямі розных хрысціянскіх канфесій, наяўнасць значнай колькасці царкоўна-палемічных прац. Сярод іншага ў бібліятэцы знаходзіліся працы беларускіх асветнікаў і царкоўных дзеячаў Пятра Скаргі, Альберта Віюка Каяловіча, Ігната Кульчынскага, Адама Нарушэвіча, Бенедыкта Дабшэвіча, Анѐла Доўгірда, Яна і Андрэя Снядэцкіх, Станіслава Юндзіла, Васіля Лужынскага і іншых [8]. Гэта бібліятэка сѐння раскідана па розных зборах, але і цяпер яна ўяўляе сабою адзін з найбольш каштоўных гістарычных кніжных збораў Беларусі.

Праваслаўная царква, якая заўжды разглядала Полацк у якасці аднаго з хрысціянскіх цэнтраў, таксама імкнулася да стварэння ў горадзе ўласных адукацыйных устаноў. Яны з’яўляліся пры буйных манастырах і храмах. Аднак стварыць самастойную адукацыйную ўстанову аж да XIX ст. царква так і не здолела. Адзінай (праўда, беспаспяховай) спробай было стварэнне Полацкай праваслаўнай духоўнай гімназіі пры Багаяўленскім манастыры (пры ім яшчэ ў XVII–XVIII стст. існавала невялікая школа). У 1788 г. пры падтрымцы пецярбургскага Сінода сюды з Невеля была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераведзена 2-класная гімназія, якая з-за невялікай колькасці выхаванцаў (большасць жыхароў рэгіѐна былі ўніятамі) праз чатыры гады была вернута назад у Невель.

У 1833 г. была ўзноўлена Полацкая праваслаўная епархія. Першым епіскапам быў прысланы з Расіі Смарагд Крыжаноўскі, які ў 1830-х гг. меў намер адкрыць у Полацку праваслаўную духоўную семінарыю. Аднак і гэтаму намеру не наканавана было спраўдзіцца. Толькі пасля ліквідацыі уніі ў 1839 г. былая Полацкая ўніяцкая духоўная семінарыя стала праваслаўнай. Яна працягвала развівацца, папаўняючыся літаратурай, якая паступала ўжо пераважна з Расіі. У 1869 г. яе фонд дасягнуў 6 тысяч тамоў, а ў 1888 г. – 8 тысяч. Нягледзячы на тое, што яшчэ ў 1839 г. семінарыя стала праваслаўнай, у бібліятэцы працягвалі захоўвацца старыя ўніяцкія зборы (па звестках дарэвалюцыйных гісторыкаў, яны займалі 18 шафаў) [5, с. 151]. Аднак у 1856 г. духоўная семінарыя была пераведзена ў Віцебск, а ў Полацку засталася толькі праваслаўная духоўная мужчынская вучэльня [4, с. 469], якая таксама мела невялікую бібліятэку.

Яшчэ ў 1786 г. пры праваслаўным Багаяўленскім манастыры была заснавана 4-класная Полацкая галоўная народная вучэльня (адчынена ў 1789 г.). Нягледзячы на суседства з манастыром, гэта была хутчэй свецкая навучальная ўстанова. У 1797 г. яна была ператворана ў малую народную вучэльню, у 1820 г. – у павятовую, а ў 1830 г. – у дваранскую вучэльню. Бібліятэка гэтай навучальнай установы фарміравалася ў адпаведнасці з яе праграмай навучання, якая ўключала вывучэнне польскай, нямецкай, рускай і лацінскай моў, граматыкі, Божага Закону, арыфметыкі, геаметрыі, архітэктуры, механікі, фізікі, малявання, усеагульнай гісторыі, усеагульнай і рускай геаграфіі [4, с. 427].

У XIX ст. у Полацку з’явілася вялікая колькасць свецкіх навучальных устаноў, якія валодалі ўласнымі бібліятэчнымі зборамі. Найбольш вядомым з іх з’яўляецца Полацкі кадэцкі корпус – пачатковая ваенная навучальная ўстанова расійскага імператарскага войска. Ён быў адчынены 25 чэрвеня 1835 г. па волі імператара Мікалая І. Корпус размясціўся ў будынках зачыненага езуіцкага манастыра. Ад манастыра ѐн атрымаў і значную частку кніжных збораў. Як ужо адзначалася, кадэцкаму корпусу з бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі былі перададзены 1752 кнігі па ваеннай справе, матэматычных і прыродазнаўчых навуках [6, с. 96]. У гэтым дачыненні Полацкаму корпусу вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пашанцавала, паколькі ў той час, па выказванні вялікага князя Міхаіла Паўлавіча (з 1831 г. ѐн быў галоўным начальнікам усіх сухапутных кадэцкіх карпусоў), «у ваенна-навучальных установах цалкам грэбавалі адным з самых важных патрабаванняў выхавання, а менавіта чытаннем выхаванцамі кніг; таму выхаванцы падчас знаходжання ва ўстановах, зусім не атрымоўваючы звычкі чытаць, разважаць і выказваць меркаванні аб прадметах уласным сваім розумам, абмяжоўваюцца засваеннем паняццяў толькі сухіх, якія не выходзяць за межы класнага выкладання» [3, с. 92].

Бібліятэка працягвала пастаянна папаўняцца за кошт набыцця кніг і перадачы выданняў у дар. У зборы корпуса паступалі, пераважна, расійскія выданні. Так, у пачатку 1840-х гг. у бібліятэцы кадэцкага корпуса ў вялікай колькасці меліся неабходныя для навучальнага працэсу катэхізіс мітрапаліта Філарэта, кароткае тлумачэнне літургіі Узнясенскага, «Руководство к умственным упражнениям при преподавании отечественного языка» Гугеля, кнігі па граматыцы і славеснасці Грэча, Глаголева і Плаксіна, падручнік Франкера і Бурдона па арыфметыцы, алгебры, геаметрыі, падручнік Арсеньева па геаграфіі, дапаможнік Кайданава па гісторыі і іншыя працы. Мелася таксама значная колькасць твораў мастацкай літаратуры, слоўнікі, атласы, «геаграфічныя сеткі», «геаметрычныя фігуры», гістарычныя карты, храналагічныя табліцы, прописі і многае іншае [3, с. 132–134]. Акрамя агульнай бібліятэкі, што размяшчалася ў асобным памяшканні, частка кніг знаходзілася ў «рэкрэацыйных пакоях» кадэтаў, а частка выдавалася ім на рукі. У 1914 г. у сувязі з пачаткам вайны з Германіяй Полацкі кадэцкі корпус быў эвакуіраваны, і сляды яго бібліятэкі для нас знаѐмыя не ў поўнай меры. Ёсць звесткі, што вялікая колькасць кніг з гэтай бібліятэкі ў 1915 г. трапіла ў Сімбірск [10; 15, с. 86]. Даволі значныя фрагменты бібліятэкі былога Полацкага корпуса захоўваюцца сѐння ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (многія з тых кніг маюць таксама пазнакі бібліятэкі Полацкай акадэміі).

Пасля паўстання 1863–1864 гг. урад прыступіў да павелічэння колькасці адукацыйных устаноў у Беларусі і Літве з мэтай выхавання ў насельніцтва большай лаяльнасці да Расіі. Узрастанню колькасці навучальных устаноў спрыяў таксама і істотны рост колькасці насельніцтва ў Беларусі.

З 1872 па 1919 г. у Полацку дзейнічала даволі вялікая настаўніцкая семінарыя [4, с. 436–437]. Яна ў значнай ступені падтрымала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэс пашырэння асветы ў сялянскім асяроддзі. Ад самага пачатку існавання семінарыі пры ѐй была заснавана бібліятэка, якая налічвала больш 8 тысяч тамоў. Акрамя яе у 1910 г. пры семінарыі быў адкрыты музей наглядных дапаможнікаў для настаўнікаў. Выпускнікі семінарыі, дакрануўшыся праз кнігу да ведаў чалавецтва, пасля неслі гэтыя веды, працуючы, пераважна, у малых сельскіх школах. Свой шлях яны таксама працягвалі з кнігай.

У Полацку існавалі таксама і жаночыя навучальныя ўстановы. Яшчэ ў 1838 г. быў заснаваны Узорны 4-класны жаночы пансіѐн для высакародных дзяўчат дваранскага паходжання. У 1872 г. ѐн быў ператвораны ў 2-класную прыватную жаночую вучэльню, у хуткім часе – у 4-класную, а пасля і ў 5-класную жаночую вучэльню. З 1869 г. дзейнічала таксама Полацкая 5-класная жаночая вучэльня імя В. Ф. Рульковіус (з 1902 г. – Полацкая жаночая гімназія) [4, с. 450]. Літаратура ў бібліятэкі жаночых вучэльняў закуплівалася для забеспячэння засваення навучэнцамі Божага Закону, рускай мовы, арыфметыкі, айчыннай гісторыі і геаграфіі, царкоўных спеваў, рукадзелля і іншых карысных для маладых паненак навук.

З 1851 г. у Полацку існавала казѐнная яўрэйская вучэльня першага разраду. Неўзабаве з’явіліся і прыватныя яўрэйскія вучэльні. Пра іх бібліятэкі мы ведаем не шмат, але ўлічваючы значэнне кнігі ў яўрэйскай культуры, сумнявацца ў іх наяўнасці не даводзіцца.

Асабліва бурна адбываўся рост колькасці рознага роду навучальных устаноў у Полацку ў пачатку XX ст. – дзяржаўных, прыватных і грамадскіх, мужчынскіх і жаночых, пачатковых і сярэдніх. Усе яны валодалі ўласнымі бібліятэкамі, якія мелі надзвычайнае значэнне для прафесійнага і агульнакультурнага развіцця навучэнцаў, станавіліся цэнтрамі культурнага жыцця не толькі гэтых устаноў, але і горада. Аднак гэта ўжо пачынаўся абсалютна іншы, новы этап у развіцці бібліятэчнай справы ў Полацку і ва ўсѐй Беларусі. Тым не менш гэты этап быў забяспечаны папярэднім шматвяковым развіццѐм бібліятэчнай справы ў Полацку.

1. *Бібліятэка* Полацкага езуіцкага калегіума // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 3 т. – Мінск, 2010. – Т. 3.– С. 77–79.

2. *Блинова Т.Б.* Иезуиты в Беларуси: роль иезуитов в организации образования и просвещения. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 425 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Викентьев В. П.* Полоцкий кадетский корпус: исторический очерк 75-летия его существования. – Полоцк : Тип. Х. В. Клячко, 1910. – 396, XLIII с.

4. *Витебская* губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). – Минск : Белорус. науч.-исслед. ин-т документоведения и архивного дела, 2009. – 523 с.

5. *Подлипский А. М.* Из истории библиотек дореволюционного Витебска // Книговедение в Белоруссии : сб. ст. / Академия наук Белорус. ССР, Фундаментальная б-ка им. Я. Коласа. – Минск, 1977. – С. 149–159.

6. *Савельева В. М.* Страницы истории библиотек Полоцка // К истории библиотечного дела в Белорусской ССР : сб. науч. работ / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина, Науч.-исслед. отд. библиотековедения. – Минск, 1975. – С. 96–100.

7. *Самусік А.* Праект адкрыцця ўніяцкай духоўнай акадэміі ў Полацку // З гісторыі ўніяцтва ў Беларусі. – Мінск, 1996. – С. 117–121.

8. *Систематический* каталог книг библиотеки Киевской духовной академии (бывшей Полоцкой униатской библиотеки) / сост. А.С. Крыловским. – Киев : Тип. И. И. Горбунова, 1906. – [2], 429 с.

9. *Суша А. А.* Уніяцкія храмы і манастыры Полацка ў XVII ст. // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска–палітычная і літаратурная дзейнасць : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Полацк, 18–19 лістап. 2004 г. – Полацк, 2005. – С. 96–105.

10. *Цыбуля В. А.* Бібліятэка Полацкай езуіцкай акадэміі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 2. – С. 37.

11. *Шавельский Г.* Из былого almae matris: Белорусская (Полоцкая) греко-унитская семинария в 1833–1834 гг., пред воссоединением униатов. – [Витебск : Тип. наследников М. Б. Неймана, 1906]. – 14 с.

12. *Ярашэвіч А.* Полацкі кляштар бернардзінцаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5.– С. 536.

13. *Ярашэвіч А.* Полацкія манастыры // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5.– С. 542.

14. *Grzebień L.* Organizacja bibliotek jezuickich w Polsce od XVI do XVIII wieku // Archiwa, Biblioteki i Muzea Kościelne. – 1975. – T. 30. – S. 225–278.

15. *Kadulska I.* Akademia Połocka: ośrodek kultury na Kresach, 1812–1820. – Gdańsk : Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego, 2004. – 312 s.

16. *Radwan M.* Carat wobiec kościoła grekokatalickiego w zaborze Rosyjskim, 1796–1839. – Roma ; Lublin, 2001. – 504 s.

**Summary**

*A. Susha.* ***The formation of the educational institutions libraries in Polatsk in the 16th–19th centuries***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

The article is devoted to the origin and development of educational institutions libraries in the most ancient Belarusian city Polatsk. Such libraries existed on the base of various church (Catholic, Uniate, Orthodox, Jewish) and secular (state and communal) schools of different level (from elementary to high schools). Some of them stored great (up to 50 000) book collections and became information and cultural centers of the region.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ